ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Onlin)

Паступіў у рэдакцыю 03.01.2023
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2023-68-1-75-77 Received 03.01.2023

**Г. В. Навасельцава**

*Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь*

# ФОТАЛЕТАПІС ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Мікола Мікуліч вядомы ў навуковым і літаратурным асяроддзях Беларусі як даследчык паэзіі – заходнебеларускай паэтычнай спадчыны 1920–1930-х гг., сучаснай беларускай лірыкі, творчасці Максіма Танка і інш. Пра легендарнага песняра Нарачы і Нарачанскага краю ў розныя гады ён апублікаваў чатыры манаграфіі: "Максім Танк і сучасная беларуская лірыка" (1994), "Максім Танк: на скразняках стагоддзя" (1999), "Паэзія рэчаіснасці: у свеце Максіма Танка" (2001), "Максім Танк: талент, заручаны з небам" (2012), якія атрымалі высокую ацэнку спецыялістаў і мелі станоўчы грамадскі рэзананс. Глыбокай дасведчанасцю ў складаных варунках грамадскай, дзяржаўнай і творчай дзейнасці народнага паэта Беларусі, станаўлення і развіцця яго мастацкай індывідуальнасці характарызуецца і падрыхтаваны М. У. Мікулічам фотаальбом "Максім Танк", які нядаўна пабачыў свет у выдавецтве "Беларуская навука"[1].

Фотаальбом "Максім Танк" з разгорнутай, грунтоўнай прадмовай М. У. Мікуліча, пад навуковай рэдакцыяй акадэміка НАН Беларусі У. В. Гніламедава прысвечаны шматаспектнаму фотаасэнсаванню літаратурнай творчасці, багатай грамадска-культурнай і дзяржаўнай дзейнасці класіка айчыннага прыгожага пісьменства. У альбоме выкарыстаны фотаздымкі з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурнага музея Петруся Броўкі, а таксама з прыватных архіваў Уладзіміра Крука, Юрыя Іванова, Анатоля Каляды, Генадзя Жынкова, Ніла Гілевіча, Алены Глагоўскай. Прадстаўлена поўная, вычарпальная фотакалекцыя, якая можа разглядацца як выдатнае візуальнае ілюстраванне да Збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах, падрыхтаванага Інстытутам літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі і выдадзенага ў 2006–2012 гг.

Фоталетапіс жыцця народнага паэта БССР, лаўрэата дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Ленінскай прэміі, акадэміка НАН Беларусі Максіма Танка, які ўвасабляе адметныя моманты, пачынаючы з маленства і да смерці пісьменніка, будзе цікавым і карысным не толькі для навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў-філолагаў, краязнаўцаў, але і для шырокага кола чытачоў. Гэтаму спрыяе арыгінальная канцэпцыя выдання, у якой візуальны малюнак – непасрэдна фотаздымак – хораша дапаўняецца цікавымі, пазнавальнымі, змястоўнымі меркаваннямі пра асобу класіка прадстаўнікоў літаратуры і культуры, у тым ліку знакамітых, якія непасрэдна і працяглы час ведалі Максіма Танка як пісьменніка і чалавека. У фотаальбоме таксама выкарыстоўваюцца выбраныя вершы паэта, якія выступаюць характэрнай вобразнай квінтэсенцыяй няпростага жыццёвага шляху майстра слова, рэпрэзентуюць яго абвостранае асэнсаванне грамадскіх праблем markнага часу, па-мастацку ўдакладняюць і дапаўняюць створаны візуальны малюнак. Такім чынам, для чытача з розным колам інтарэсаў узнаўляюцца і хрэстаматыйныя вехі біяграфіі класіка, і менш вядомыя моманты з яго жыццяпісу, адлюстроўваецца шматграннае творчае асяроддзе, уплыў якога на развіццё таленту і асобы паэта яшчэ патрабуе паглыбленага літаратуразнаўчага вывучэння.

Разгорнутай прадмовай да фотаальбома выступае глыбокі, ёмісты, змястоўны артыкул аўтара праекта М. У. Мікуліча, укладальніка выдання, "Дарога, закалыханая жытам", які прысвечаны асэнсаванню таленту Максіма Танка як мастацкага і грамадска-культурнага феномена свайго часу. Як вядома, даследчык быў блізка знаёмы з народным паэтам БССР, працяглы час падтрымліваў з ім сяброўскія стасункі. Пераканаўча даказваецца, што М. Танк, засноўваючыся на традыцыях беларускага фальклору, ідэйна-эстэтычных набытках і дасягненнях папярэднікаў, найперш Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, *"імкнуўся асэнсоўваць з'явы і працэсы заходнебеларускай рэчаіснасці ў іх анталагічным змесце, бачыць іх духоўна-сацыяльную прыроду"* (с. 7). Выяўляецца ўплыў народнай лірыкі

© Навасельцава Г. В., 2023

[1] Максім Танк : фотаальбом / уклад., прадм.: М. У. Мікуліч ; навук. рэд. У. В. Гніламедаў ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр452 даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 303 с.

на фарміраванне мастацкага стылю аўтара, асэнсоўваюцца вытокі яго асацыятыўна-метафарычнага светабачання, экспрэсіўнасці светаадчування.

Трэба адзначыць, што эмацыянальна ўплываюць на чытача і змешчаныя ў фотаальбоме вершы "На касагоры" (1930), "Спатканне" (1936), а таксама вядомы са школьнага падручніка "Паслухайце, вясна ідзе..." (1937). Адмыслова падабраны фотарад паслядоўна паказвае Максіма Танка сярод дзеячаў заходнебеларускага грамадска-культурнага руху, сярод якіх, у прыватнасці, Рыгор Шырма, Янка Шутовіч, Міхась Васілёк, Хведар Ілляшэвіч і многія іншыя. Грамадскую атмасферу таго часу наглядна перадаюць фотаздымкі пісьменніка з сябрамі рэдкалегіі газеты "Наша воля", з удзельнікамі Беларускага студэнцкага саюза і інш. Створаны візуальны вобраз удала дапаўняе вокладка першага зборніка вершаў Максіма Танка "На этапах" (1936), як вядома, канфіскаванага польскай цэнзурай. Разважанні чытача скіроўвае прароцкае сведчанне, выказанае ў 1936 г. Р. Баравым. Ім падкрэслівалася, што мастацкая муза Максіма Танка зарадзілася ў звонкім шуме медна-сасновага наднарачанскага бору. Пеністыя хвалі Нарачы і Мястра, а пазней шырокія этапныя дарогі былі яе калыскай. Прыйшоўшы ў беларускую літаратуру з першым зборнікам, паэт загарэўся на Заходнім небасхіле зоркай першай велічыні: *"Думаем, што нам яшчэ прыдзецца быць сьведкамі, калі ягоны талент падымецца да Вялікага Сузор'я – Купалы-Коласа"* (с. 35).

Дарэчы, як ілюструе адзін з фотаздымкаў выдання, Міхась Лынькоў, Максім Танк, Пятрусь Броўка сустракаліся з Янкам Купалам у Мінску ў 1940 г. А ў 1947 г. Максім Танк у прадстаўнічай літаратурнай кагорце віншуе Якуба Коласа з юбілеем. Пазней, у 1956 г., слынны беларускі пясняр выкажацца проста, шчыра і сардэчна пра свайго маладога калегу: *"Максім. Максім. Моцна ён сядзіць каранямі ў зямлі. Такіх бура не вырывае. Цяжка яму было прабівацца. Вы ўсе па вольнай зямлі хадзілі, а ён спрабаваў голас у такой жа бядзе, як і я калісьці. Толькі на нейкіх трыццаць гадоў пазней"* (с. 53). Як пасведчыць у 1972 г. ужо Пятрусь Броўка, ён сам упершыню пачуў пра Максіма Танка ад Валянціна Таўлая і Алеся Салагуба, а з яго паэзіяй пазнаёміўся дзякуючы Янку Купалу і Якубу Коласу, якім малады заходнебеларускі аўтар даслаў свой першы паэтычны зборнік: "*Помню, як у хаце Янкі Купалы, дзе быў у той час і Якуб Колас, чыталі вершы Максіма Танка. Рэвалюцыйная рамантыка, глыбокая народнасць, нейкая асаблівая лірычная задушэўнасць прасякала іх, і нашы старэйшыны, слухаючы вершы Танка, не раз выказвалі сваё захапленне*" (с. 56).

Як далей працягвае М. У. Мікуліч, трагізм і драматызм Вялікай Айчыннай вайны майстра слова глыбока выявіў у многім з дапамогай сродкаў фальклорна-рамантычнай умоўнасці, яго творчасць ваеннага перыяду грунтуецца на багатай народна-фальклорнай спадчыне. Цалкам заканамерна, што рэпрэзентатыўным творам тут выступае знакаміты верш "Родная мова" (1943), які не будзе перабольшаннем назваць праграмным і для творчасці аўтара, і для беларускай літаратуры гэтага часу ў цэлым. Фотарад прадстаўляе Максіма Танка як супрацоўніка сатырычнай газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну", а таксама ілюструе, што на дарогах вайны побач з творцам знаходзіліся Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Кандрат Крапіва і іншыя майстры слова, цесныя ўзаемастасункі з якімі не былі страчаны і ў пасляваенны час. Ва ўступным артыкуле слушна падкрэсліваецца, што ў адрозненне ад многіх іншых беларускіх паэтаў *"гераічная канцэпцыя жыцця чалавека, народна-патрыятычныя матывы і вобразы знайшлі сваё развіццё і ў пасляваеннай творчасці М. Танка"* (с. 13). Гэта скіроўвае чытача да самастойных разваг і ўдумлівага вывучэння паэзіі класіка.

Прыцягваюць, а таксама ўтрымліваюць увагу чытача вобразы, якія варта назваць канстантамі ў творчай спадчыне аўтара. Як вядома, скразным для танкаўскай паэзіі з'яўляецца вобраз Нарачы, заяўлены і ў многіх вершах, і ў назвах асобных зборнікаў, што яшчэ раз даказваюць прадстаўленыя фотаздымкі. Ілюстрацыі возера Нарач як вялікай сінь-вады задаюць каардынаты эмацыянальнага ўспрымання асобы пісьменніка, яго адметнага ўнутранага свету. Мы бачым Максіма Танка на Нарачы падчас адпачынку як у адзіноце, так і побач з Якубам Коласам, Максімам Лужаніным, падчас рыбалкі ў непагоду або на маторнай лодцы з Міхасём Лыньковым. Таксама на Нарачы – на ўлонні прыроды – пісьменнік паказаны ў хвіліны творчага натхнення. Гарманічна ўспрымаецца выказанае ў 1985 г. вядомым рускім перакладчыкам Якавам Хелемскім сведчанне пра кнігу "Нарачанскія сосны", якая адзначана Ленінскай прэміяй: *"Чысціня гучання і яснасць думкі, сардэчнасць выказвання і дакладнасць выяўлення, рытмічная разняволенасць і традыцыйная мелодыка – уласцівасці, характэрныя для Танка замалада, у гэтай кнізе знаходзяць асаблівую прывабнасць"* (с. 219).

Думаецца, што вялікім творчым поспехам пісьменнік абавязаны сваёй малой радзіме, духоўная сувязь з якой нязменна сілкавала яго паэтычныя здабыткі. Так, сапраўды, як падкрэслівае М. У. Мікуліч, у сваіх творах Максім Танк *"паэтызаваў родны дом, бацькоўскае котлішча з усім яго шматстайным гаспадарча-побытавым начыннем, асэнсоўваў свой паступовы адыход ад звыклага вясковага ўкладу жыцця, згадваў пачатак пісьменніцкага шляху"* (с. 19). На шэрагу фотаздымкаў у розных ра-

курсах паказана Пількаўшчына, яе ўрочышчы, хутар Жукова – малая радзіма мастака слова, і за розныя гады – фотаздымкі бацькі і маці, Івана Хведаравіча Скурко, Домны Іванаўны Скурко. Дакладна і хораша раскрываюць каларыт часу партрэты старэйшых сваякоў і аднавяскоўцаў з Пількаўшчыны. Дэманструюць цёплую атмасферу ўзаемаразумення і згоды фотаздымкі з уласнай сям'ёй – з жонкай Любоўю Андрэеўнай Скурко, дочкамі Верай і Ірай, з сынам Максімам. Шэраг фотапрыкладаў выяўляе пісьменніка ўжо ў сталым узросце, паказвае яго адпачынак з унукамі на Нарачы.

З прызнанняў самога Максіма Танка вынікае, што ён заўсёды імкнуўся вярнуцца і на Нарач, і да роднай сядзібы. Так, у 1970 г. пісьменнік шчымліва прызнаецца пра адну са сваіх паездак дадому: *"Абышоў я асірацелы свой хутарок. Заглянуў у пуню. Аж галава закружылася ад паху свежага сена, ад успамін. Усё напамінае бацьку: і плуг пад страхой гумна, і каса – над свірнам, і маткі лазы на лапці, і сякера – на дрывотні, і старыя вуллі – у садзе. І нейкі боль сціснуў сэрца. Бо ўжо і мама апошняй свечкай дагарае на гэтай святой для мяне сялібе"* (с. 69). Гэтае сведчанне дапамагае пабачыць партрэт мастака слова ў выразных чалавечых якасцях нават малазнаёмаму з айчыннай літаратурай чытачу, з чаго можа пачынацца і цікавасць да творчай спадчыны класіка, і да беларускага прыгожага пісьменства наогул.

Максім Танк актыўна і мэтаскіравана папулярызаваў беларускае мастацкае слова, айчынную літаратуру, пра што сведчаць яго шматлікія сустрэчы з рознымі сацыяльнымі групамі чытачоў: напрыклад, са студэнтамі фізіка-матэматычнага факультэта БДУ (Мінск, 1948 г.), з чытачамі ў Цэнтральнай кнігарні (Мінск, 1956 г.), з вучнямі сярэдняй школы № 54 (Мінск, 1958 г.), з настаўнікамі піянерскага лагера на Нарачы (1959 г.). Пісьменнік паказаны сярод удзельнікаў рэспубліканскай канферэнцыі бібліятэчных работнікаў (Мінск, 1960 г.), сярод рабочых МАЗа (Мінск, 1961 г.), сярод удзельнікаў вайсковых вучэнняў "Бярэзіна" (1978 г.). Цікавыя, рэдкія фотасюжэты адлюстроўваюць мастака слова ў розныя гады на святе паэзіі ў Вязынцы, на святе паэзіі ў Мікалаеўшчыне, на святе паэзіі ў Ляўках і інш.

Творца выяўляе сябе таксама ў грамадска-культурнай дзейнасці міжнароднага ўзроўню, пра што сведчаць яго паездкі і выступленні за мяжой. Гэта і падарожжа на цеплаходзе "Победа" вакол Еўропы (1956 г.), і наведванне ў складзе савецкай дэлегацыі Кітая (1957 г.), і ўдзел у Тыдні беларускай літаратуры ва Украінскай ССР (1957 г.), у Дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Літоўскай ССР (1960 г.), у Днях беларускай літаратуры ў Тувінскай АССР (1964 г.), у Днях беларускай літаратуры ў Расіі (Краснаярскі край, 1964 г.). Самабытны фотарад ілюструе таксама цікавыя паездкі ў Злучаныя Штаты Амерыкі, Фінляндыю (1960 г.), Чылі (1971 г.) і інш.

Змешчаныя ў фотаальбоме вершы "Рукі маці" (1951), "Ave Maria" (1957), "Перапіска з зямлёй" (1964), "Мыццё бабкі Улляны" (1967), "У парэпанай раме дзвярэй" (1971), "Біяграфічны фільм" (1978), "Мне пагаварыць бы" (1991) рэпрэзентуюць адметнае аўтарскае ўсведамленне шырокага дыяпазону маральна-этычных, духоўных, сацыяльных праблем. Максім Танк, дэпутат і старшыня Вярхоўнага Савета БССР, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, старшыня Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, глыбока асэнсоўваў і творчыя, і грамадскія пытанні і супярэчнасці. Так, яшчэ ў 1954 г. творца звяртае ўвагу на тое, што *"зараз наша беларуская мова, жывыя крыніцы якой перакрыты іншамоўнымі школай, прэсай, радыё, прапагандай і міграцыяй, – усё больш і больш адступае перад экспансіямі суседніх дзяржаўных моў, губляе свае пазіцыі і знікае"* (с. 71). У той жа час творца даказвае ўласным прыкладам, што глыбокі, мэтаскіраваны талент можа надзвычай шмат зрабіць і для развіцця роднай мовы, і для ўзбагачэння роднай літаратуры. У прыватнасці, ужо ў сведчанні за 1978 г. аўтар прызнаецца, што стараецца пісаць лаканічна, што ўсё часцей, не зважаючы на крытыку, парушае мяжу паміж прозай і паэзіяй, паколькі гэтая мяжа, як табу, не існавала для яго з дня нараджэння першых вершаў.

Творчая спадчына класіка беларускай літаратуры заўсёды прыцягвала ўвагу даследчыкаў. Выданне лаканічна падае інфармацыю пра кнігі Уладзіміра Калесніка, Дзмітрыя Бугаёва, Вячаслава Рагойшы, Уладзіміра Міцкевіча, Міколы Арочкі, Анатоля Вераб'я, Міколы Мікуліча, Алены Сузько, Святланы Калядка, Леаніда Дранько-Майсюка, прысвечаныя Максіму Танку. А іх болей, чым пра каго іншага з грамадска-культурнага асяроддзя Беларусі. Такім чынам, фотаальбом "Максім Танк" цікавы і карысны шырокаму колу чытачоў, ён можа быць плённа выкарыстаны ў арганізацыі дзейнасці літаратурных музеяў, у правядзенні выхаваўчай працы сярод моладзі, у папулярызацыі беларускай літаратуры і культуры ў СМІ.

**Информация об авторе**

**Новосельцева Анна Викторовна** – кандидат филологических наук, доцент. Витебский государственный университет имени П. М. Машерова (пр-т Московский, 33, 210038, Витебск, Республика Беларусь). E-mail: novoseltseva.anna@mail.ru

**Information about the author**

**Anna V. Novoseltseva** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor. P. M. Masherov Vitebsk State University (33 Moskovskiy Ave., Vitebsk 210038, Belarus). E-mail: novoseltseva.anna@mail.ru